УДК 81’373

# УСТАЎНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ<br>Ў ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ ТВОРАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

***В. В. Касцюкевіч*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***А. М. Шубадзёрава***,
канд. філалаг. навук, дацэнт

У беларускай мове ўстаўныя канструкцыі часта сустракаюцца ў творах многіх аўтараў, адным з якіх з’яўляецца Уладзімір Караткевіч. Устаўныя канструкцыі служаць асноўным сродкам фарміравання і выражэння дадатковых паведамленняў у працэсе развіцця галоўнай думкі.

У выніку даследавання ўстаўных канструкцый быў праведзены аналіз іх семантычных і структурных асаблівасцей. Паводле структуры сярод устаўных канструкцый выкарыстоўваюцца тры разнавіднасці: устаўныя канструкцыі суадносныя: а) са словам; б) са словазлучэннем; б) са сказам.

Устаўныя словы прымаюць формы адпаведных членаў асноўнага сказа, з якімі злучаюцца, але ў адрозненне ад іх характарызуюцца абавязковай інтанацыйнай адасобленасцю: *За Койданавым атрад Свентажэцкага зліўся з атрадам Дыбоўскага* ***(Зарэмбы)*** *і сумесна прыняў прысягу* (У. Караткевіч. Горад паўстае). Устаўныя словазлучэнні ў творах У. Караткевіча будуюцца па тых жа мадэлях, як і падпарадкавальныя: ***Тых, хто ўсё ж насіў, чакаў на першы раз штраф 25 рублёў срэбрам*** *(кошт каровы)****...*** (У. Караткевіч. Горад паўстае).

Устаўныя сказы па структуры і лексічным саставе нічым не адрозніваюцца ад неўстаўных: яны могуць быць розных тыпаў і рознага лексічнага складу. Устаўныя простыя сказы ў публіцыстычных творах У. Караткевіча бываюць неразвітыя: (*У люстры сажалкі адбіваецца жоўтая зара і цені соснаў на тым беразе* ***(брохкае рыба)*** (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі) і развітыя *І разлівы, як мора, і паплавы з акіянам кветак* ***(часам чалавек з вудай хаваецца ў іх)****, з рамонкамі, шалёнай вясёлкай разнатраўя* (У. Караткевіч. Зброя).

Устаўныя канструкцыі ў творах пісьменніка маюць будову не толькі простага сказа, але і складанага: ***Магчыма, камусьці пашанцуе знайсці печ з «комінам»*** *(раней так называўся абмазаны глінай конус-дымаход з лазы, пад якім гарэла лучына)* (У. Караткевіч. Наш агульны клопат). У прыведзеным тэкставым урыўку ўжываецца ўстаўны складаназалежны сказ з даданай азначальнай часткай.

Устаўныя канструкцыі ў публіцыстычных творах У. Караткевіча адыгрываюць важную ролю. Яны дазваляюць не толькі актывізаваць семантыку аўтарскага выказвання, але і зрабіць яго выразным і эмацыйна насычаным.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова